МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

пр. Пераможцаў, 11; 220004, г.Мінск
тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БІК: AKBB BY 2X; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

пр. Победителей, 11; 220004, г.Минск
тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БИК: AKBB BY 2X; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

01.09.2021 № 01-16/к-431
На № ________ ад __________

(для інфармавання зацікаўленых)
e-mail:
e-mail:

Магілёўскі гарадскі
выканаўчы камітэт
(для звестак)

Аб разглядзе звароту

По выніках разгляду электроннага звароту адносна архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі аб’екта “Многофукциональное здание бизнес-центра по ул. Ленинская, 50А в г. Могилеве, со сносом двухэтажного жилого дома, гаражей и благоустройством территории” (далей – аб’ект), якая была вынесена на грамадскае абмеркаванне Магілёўскім гарвыканкамам, паведамляе наступнае.

Узгадненне архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі на стадыі грамадскага абмеркавання з Міністэрствам культуры заканадаўствам аб культуры і заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах у сферы культуры не прадугледжана.

Разам з тым, Міністэрства культуры лістом ад 30.06.2021 № 04-09/923/н інфармавала Магілёўскі гарвыканкам аб тым, што вышынныя параметры запланаванага шматфункцыянальнага будынка бізнес-цэнтра па вул. Ленінская, 50А ў г. Магілёве не адпавядаюць горадабудаўнічым рэгламентам дэталёвага плана цэнтральнай часткі г. Магілёва і рэжымам утрымання і выкарыстання, устаноўленым праектам зон аховы гістарычнага цэнтра г. Магілёва (пастанова Міністэрства культуры ад 19.10.2005 № 25).

Названым лістом адзначалася, што неабходна карэкціроўка аб’ёмна-прасторавага рашэння адзначанага вышэй будынку з улікам адаптацыі да гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія размешчаны побач,

і прывядзенні архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі дадзенага аб’екта ў адпаведнасць з заканадаўствам ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Па інфармацыі Магілёўскага гарвыканкама 20.08.2021 адбылося пасяджэнне пастаянна дзеючай камісіі па правядзенні грамадскага абмеркавання ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці (далей – камісія) па вышэйадзначаным аб’екце (заказчык – ТАА “Шафаг 88”).

Пры разглядзе архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі аб’екта былі агучаны рэкамендацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і па выніках пасяджэння камісія вырашыла абавязаць заказчыка атрымаць неабходныя ўзгадненні па аб’екце з Міністэрствам культуры.

Разгляд адпаведнай навукова-праектнай дакументацыі Міністэрствам культуры будзе арганізаваны ва ўстаноўленым парадку пры яе паступленні ў міністэрства.

Звяртаем увагу, што пытанні пажарнай бяспекі адносяцца да кампетэнцыі органаў і падраздзяленняў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

Права растлумачваць пытанні адзначанага ў звароце тэхнічнага кодэкса ўсталяванай практыкі, які зацверджаны загадам Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ад 17.12.2010 № 485, належыць названаму міністэрству.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткай першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра В.І. Грамада

04 Заматаеў 203 46 21
04 Ходар 203 75 66